


# З НАДЫХОДЗЯЧЫМ СВЯТАМ ВЯСНЫ І ПРАЦЫ!





ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 7(981) | АЎТОРАК, 25 красавіка 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная


**Са з'езда галіновага прафсаюза**

## НАДЗЁННЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПАТРАБУЮЦЬ ВЫРАШЭННЯ

У Мінску адбыўся III з'езд Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. У ім прынялі ўдзел 254 дэлегаты і 97 запрошаных. Сярод ганаровых гасцей з'езда былі: старшыня ФПБ У.Ганчарык, віцэ-прэм'ер Рэспублікі Беларусь У.Замяталін, саветнік Прэзідэнта РБ С.Посахаў, міністр адукацыі рэспублікі В.Стражаў, міністр спорту і турызму Беларусі Я.Ворсін, міністр працы РБ І.Лях, рэктары вядучых вну рэспублікі і інш.

Са справаздачным дакладам на ім перад дэлегатамі выступіла старшыня рэспубліканскага камітэта галіновага прафсаюза Т.І.Чобатава.

Адзначалася, што ў складаных сацыяльна-эканамічных умовах галіновы прафсаюз, яго рэспубліканскі камітэт, прафсаюзныя органы ўсіх узроўняў прынцыпова і настойліва ажыццяўлялі абарону працоўных правоў, карэнных жыццёвых інтарэсаў работнікаў галіны, уздымалі надзённыя праблемы адукацыі, дабіваліся іх вырашэння на дзяржаўным узроўні.

Між тым, глыбокую заклапочанасць дэлегатаў з'езда выклікаў той факт, што прынцып астаткавага фінансавання галіны крайне негатыўна ўплывае на яе развіццё. Так, за апошнія пяць гадоў з дзяржаўнага бюджэту на адукацыю выдзялялася не больш 6 % ад яго расходнай часткі, што недастаткова нават для захавання вучэбна-матэрыяльнай базы ўстаноў, не кажучы аб яе ўдасканальванні. Працягвае няўхільна зніжацца жыццёвы ўзровень работнікаў адукацыі і навукі. Па выніках мінулага года сярэдняя заработная плата ў галіне склала 58,7 % ад аналагічнага ўзроўню ў прамысловасці, стаўка заработнай платы маладога спецыяліста з вышэйшай адукацыяй з 1 студзеня 2000 года складае 12780 руб., або 36,8 % мінімальнага спажывецкага бюджэту.

На з'ездзе была прынята рэзалюцыя, у якой ад імя больш чым 520 тысяч членаў прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі выказаны рашучыя патрабаванні прыняцця дзейсных мер па вырашэнню неадкладных праблем галіны кіраўніцтвам краіны, органамі дзяржаўнага кіравання. Сярод першачарговых патрабаванняў, у прыватнасці, давядзенне ў 2000 годзе сярэдняга ўзроўню аплаты працы работнікаў адукацыі да сярэдняга ўзроўню заработнай платы ў прамысловасці, устанаўленне аплаты працы па першым тарыфным разрадзе і памера стыпендыі не ніжэй бюджэту пражытачнага мінімуму і інш.

З'езд заклікаў усіх членаў прафсаюза падтрымаць гэтыя патрабаванні і праявіць салідарнасць у барацьбе за карэннае паляпшэнне дабрабыту работнікаў адукацыі і навукі.

На з'ездзе старшынёй рэспубліканскага камітэта галіновага прафсаюза на новы тэрмін абрана Т.І.Чобатава.

У рабоце з'езда прынялі ўдзел старшыня прафкома ГДУ Г.І.Варатніцкі, старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава, якая абрана членам Прэзідыума ЦК галіновага прафсаюза.

## АБМЕРКАВАЛА РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

У красавіку прайшло пасяджэнне рэдакцыйнай калегіі навукова-тэарэтычнага часопіса "Известия Гомельского государственного университета имени Ф.Скорины". Вёў пасяджэнне галоўны рэдактар выдання член-карэспандэнт НАН Беларусі, д.ф.-м.н., прафесар Л.А.Шамяткоў.

Рэдакцыйнай калегіяй былі разгледжаны перспектыўны тэматычны план часопіса, вызначаны прыярытэтныя накірункі і змест бліжэйшых нумароў. Прызнана мэтазгодным, што дэбютныя нумары часопіса "Известия Гомельского государственного университета имени Ф.Скорины" будуць выходзіць на аснове міжрэспубліканскіх навуковых зборнікаў "Вопросы алгебры", "Беларуская літаратура", "Беларуская мова", якія ўжо раней выдаваліся ў нашай навучальнай установе і маюць высокі навуковы статус у рэспубліцы і за яе межамі. Але ўжо ў бягучым годзе запланаваны выпуск у свет нумароў, прысвечаных праблемам іншых навуковых галін. Таксама на пасяджэнні былі зацверджаны "Правілы афармлення артыкулаў для аўтараў" і прынята рашэнне апублікаваць іх у газеце "Гомельскі універсітэт".

**(Аб правілах афармлення артыкулаў для аўтараў часопіса чытайце на 4-й стар. газеты).**

## ВУЧОБА ЗАКАНЧВАЕЦЦА, ХУТКА – САМАСТОЙНАЯ ПРАЦА



Дзе ён той горад, пасёлак ці вёсачка, адкуль пачнуцца першыя самастойныя крокі ў працоўным жыцці? Гэта пытанне для пяцікурснікаў універсітэта было напачатку красавіка самым хвалюючым і злабадзённым. Дзяржаўная камісія па размеркаванню, што працавала на працягу тыдня ва універсітэце, вырашала лёс кожнага з 760 сёлетніх выпускнікоў з улікам поспехаў у вучобе кожнага з іх на працягу пяці гадоў студэнцкага жыцця.

У педагагічных кадрах на сённяшні дзень — самая вострая патрэба. Прыкметай сёлетняга размеркавання стала наяўнасць даволі значнай колькасці месцаў для выпускнікоў педспецыяльнасцей у г.Гомель. 96 студэнтаў, якія набралі вышэйшую колькасць балаў па паспяховасці, атрымалі накіраванні на працу ў наш абласны цэнтр. Больш за ўсё школам горада спатрэбілася настаўнікаў фізічнай культуры, англійскай, беларускай, нямецкай моў, матэматыкі. Не дасталося месц у горадзе толькі біёлагам і выпускнікам спецыяльнасці "Геаграфія і нямецкая мова".



9 лепшых выпускнікоў папоўняць працоўны калектыў ГДУ. Амаль палова з іх — выкладчыкі англійскай мовы. У вну г.Гомеля — кааператыўным інстытуце і тэхнічным універсітэце імя П.О.Сухога чакаюць адпаведна 1 і 3 нашых выпускнікоў па спецыяльнасцях "Англійская мова", "Гісторыя і англійская мова", "Матэматыка".

Каля 70 маладых спецыялістаў накіраваны ў раёны так званай чарнобыльскай зоны — Брагінскі, Хойніцкі, Веткаўскі, Чачэрскі і Кармянскі раёны.

Свабодныя размеркаванні атрымалі юнакі і дзяўчаты, якія маюць на гэта права згодна заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

**На здымках: 1. Група выпускнікоў эканамічнага факультэта (злева направа): скарынаўскі стыпендыят Іван Шчарбакоў, Уладзіслаў Зайцаў, Вольга Башлакова, стыпендыят Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Генадзь Ленінец і Ганна Саковіч.**

**2. Выпускнік гістарычнага факультэта стыпендыят імя Я.Карскага Яўген Фурсееў атрымаў накіраванне на працу ў тэхнічны універсітэт імя П.О.Сухога.**

**Фота У.Чысціка.**

## ПРЭМІІ – ТАЛЕНАВІТАЙ МОЛАДЗІ

Гомельскі абласны выканаўчы камітэт прыняў рашэнне устанавіць 10 штогадовых прэмій аблвыканкома для падтрымкі найбольш таленавітых маладых вучоных і спецыялістаў ва ўзросце да 35 гадоў. Зацверджана абласная камісія з 9 чалавек па адбору кандыдатаў на прысуджэнне прэмій, якую ўзначальвае намеснік старшыні аблвыканкома, кандыдат эканамічных навук У.У.Давідовіч.

Прэміі прадугледжаны з мэтай стымулявання творчага развіцця маладых таленавітых вучоных і спецыялістаў: навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, дактарантаў, магістраў, інжынерна-тэхнічных работнікаў праектных арганізацый, якія займаюцца даследчай дзейнасцю па адным з навуковых напрамкаў, што распрацоўваюцца ў вну, на прадпрыемствах, у навукова-даследчых і праектных інстытутах, пераможцаў конкурсаў сярод маладых вучоных на лепшую навуковую работу, публікацыю, вынаходніцтва і г. д.

Аблвыканкомам зацверджаны наступныя штогадовыя прэміі:

— 3 прэміі ў памеры 20 мінімальных заработных плат кожная для маладых вучоных за ўдзел у выкананні дзяржаўных і рэгіянальных навукова-тэхнічных праграм;

— 3 прэміі ў памеры 15 мінімальных заработных плат кожная для маладых вучоных за актыўны ўдзел у прыкладных распрацоўках;

— 2 прэміі ў памеры 10 мінімальных заработных плат кожная для маладых вучоных за дасягненне значных вынікаў у вынаходніцкай дзейнасці;

— 2 прэміі ў памеры 8 мінімальных заработных плат кожная для маладых вучоных за лепшую навуковую публікацыю.

Вылучэнне кандыдатаў ажыццяўляюць вучоныя саветы, саветы маладых вучоных вну і навукова-даследчых, праектных інстытутаў.

Матэрыялы (рашэнні саветаў, творчыя характарыстыкі) накіроўваюцца штогод да 1 лістапада ў камісію для разгляду.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, студэнты філалагічнага факультэта і факультэта фізічнай культуры горача віншуюць **ХАЛЯЎКА** Алену Іванаўну з кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства і **БАНДАРЭНКУ** Канстанціна Канстанцінавіча з кафедры фізічнага выхавання і спорту з прысваеннем ім Прэзідыумам БелВАКа вучонага звання дацэнта па адпаведных спецыяльнасцях.*

❀❀❀

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры тэарэтычнай фізікі горача віншуюць **АЛФЁРАВУ** Таццяну Анатольеўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.*

## ПЕРШАЯ АБАРОНА Ў НОВЫМ САВЕЦЕ



Загадам БелВАКа ад 4 студзеня 2000 года ў нашым універсітэце створаны рэгіянальны Савет па абароне дысертацый па эканамічных навуках (палітычная эканомія, эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай). У склад Савета ўвайшлі вядомыя вучоныя з Мінска, Гомеля і Магілёва. Яго работу ўзначаліў доктар эканамічных навук, прафесар М.В.Навучыцель, прозвішча якога шырока вядома за межамі рэспублікі.

Стварэнне такога Савета даўно стала надзённай неабходнасцю не толькі для Гомельшчыны, але і для сумежных з ёй абласцей Беларусі, Расіі і Украіны. Акрамя падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай атэстацыі дзейнасць Савета будзе садзейнічаць вырашэнню многіх праблем стабілізацыі рэгіянальнай эканомікі пераходнага перыяду, а таксама трансфармацыі эканамічных адносін і міжрэгіянальных сувязей у постчарнобыльскі перыяд.

11-га красавіка адбыліся дзве першыя абароны на атрыманне вучоных ступеняў кандыдата эканамічных навук. Іх паспяхова вытрымалі Л.М.Крывашэева **(на здымку)** з кафедры эканамічных тэорый (навуковы кіраўнік — к.э.н., дацэнт Б.У.Сарвіраў) і А.Л.Ракіцкая (Гомельскі кааператыўны інстытут, навуковы кіраўнік — к.э.н., дацэнт А.А.Навумчык).

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## АЛЬТЭРНАТЫВА МОЛАДЗІ

Мы прыходзім у гэты свет зусім нявопытнымі, не ведаючы мэты, не будуючы планаў. Паступова, з цягам часу, у нас з'яўляюцца інтарэсы, імкненні. Але перад любым маладым чалавекам, які толькі пачынае свой жыццёвы шлях пасля школы, заўсёды стаіць шэраг пытанняў маральнага, інтэлектуальнага і творчага плана. Чым заняцца, як рэалізаваць свае магчымасці і таленты? А галоўнае — каб ад гэтага было добра і мне, і грамадству, у якім я жыву, таму што мне ад гэтага таксама будзе лепш.

Зараз існуе шмат розных плыняў, арганізацый, проста тусовак, якія знешне здаюцца даволі прывабнымі, а прагматычная напоўненасць іх на справе або адсутнічае, або нават негатыўная.

У любой краіне ў пераходныя перыяды развіцця, калі старыя ўстоі разбураны, а новыя яшчэ не створаны, маладзёжная праблема становіцца адной з галоўных.

Альтэрнатыву вуліцы, духоўнай спустошанасці і апушчанасці прапаноўваем вам мы. Мы — гэта Беларускі патрыятычны саюз моладзі. Хто мы і што мы?

Беларускі патрыятычны саюз моладзі быў створаны больш двух гадоў назад ініцыятыўнымі і энергічнымі людзьмі з мэтай аб'яднання моладзі і сумеснага рашэння шматлікіх маладзёжных праблем, рэалізацыі свайго творчага патэнцыялу і актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці нашай краіны.

Ініцыятыва стварэння БПСМ была актыўна падтрымана кіраўніцтвам дзяржавы і асабіста Прэзідэнтам А.Р.Лукашэнкам.

За час свайго існавання патрыятычны саюз аб'яднаў у сваіх радах больш 160 тысяч маладых людзей. Каля 20 тысяч юнакоў і дзяўчат, школьнікаў і студэнтаў з'яўляюцца членамі БПСМ у Гомельскай вобласці.

У навучальных установах, на прадпрыемствах і ў гаспадарках краіны створаны, пастаянна ствараюцца і актыўна дзейнічаюць пярвічныя арганізацыі нашага саюза. Ёсць яны і ў нашым універсітэце.

Члены БПСМ з задавальненнем удзельнічаюць у розных мерапрыемствах і конкурсах, якія праводзяцца пад эгідай саюза, актыўна рэалізуюць свой інтэлектуальны і творчы патэнцыял, садзейнічаюць развіццю розных маладзёжных праграм і праектаў.

Дзякуючы актыўнасці арганізацыі шматлікія праблемы і ініцыятывы падтрыманы органамі дзяржаўнай улады і грамадскасцю.

Шмат маладых людзей, членаў БПСМ, знайшлі ў радах патрыятычнага саюза ажыццяўленне сваіх ідэй, планаў і мэтаў.

Беларускі патрыятычны саюз моладзі прынёс у грамадскае жыццё многае: адраджэнне студатрадаўскага руху і круглагадовае працаўладкаванне моладзі, арганізацыю летніх турыстычных лагераў, правядзенне музычных фестываляў і конкурсаў.

Незабыўнай падзеяй для студэнтаў Гомеля стаў традыцыйны фестываль каманд КВЗ "Зімовая вясёлка". Яркія ўражанні прывезлі студэнты з міжнароднага турыстычнага лагера "Адзінства". Шмат маладых людзей выкарысталі магчымасць падарожнічаць і адпачываць дзякуючы маладзёжнаму цэнтру "Юнацтва", які працуе пры абкоме БПСМ. Сотні падлеткаў, аматараў хакея і футбола, аб'ядналі спаборніцтвы "Залатая шайба" і "Скураны мяч" на прызы БПСМ.

Яшчэ шмат праграм і праектаў рэалізуе моладзь у будучым. У радах БПСМ у вас ёсць магчымасці зрабіць жыццё моладзі нашай вобласці, горада і ГДУ, у прыватнасці, больш насычаным, цікавым і змястоўным.

Кожны жадаючы можа прыйсці да нас і працаваць разам з намі, прапанаваць свае планы, ідэі, пажаданні. Мы будзем рады садзейнічаць любой ініцыятыве і працаваць разам. Заняткі нашы living рознабаковыя, і работа па душы знойдзецца ўсім!

Прыходзьце, мы чакаем вас! ПА БПСМ знаходзіцца ў галоўным корпусе ГДУ, п. 4-10.

**Павел КАВАЛЁЎ,**
**нам.сакратара пярвічнай арганізацыі БПСМ.**

*Студэнцкая навукова-даследчая работа*

## З ВЫСОКАЙ АКТЫЎНАСЦЮ

У рамках дзён геолага-геаграфічнага факультэта праведзена навукова-даследчая канферэнцыя студэнтаў "Актуальныя пытанні навук аб Зямлі", у рабоце якой удзельнічалі звыш 90 студэнтаў і 7 выкладчыкаў. Было заслухана 30 дакладаў. У ходзе канферэнцыі працавалі тры секцыі: геаграфіі (старшыня — ст.выкладчык кафедры геаграфіі У.Я.Пашук), экалогіі (аўтар гэтых радкоў), геалогіі і разведкі карысных выкапняў (ст.выкладчык кафедры геалогіі і разведкі Л.Л.Фядосенка).

На секцыі геаграфіі высокі ўзровень дакладаў прадэманстравалі пяцікурснікі М.Наўроцкі, А.Цыганоў, А.Курашоў, У.Бейзераў і студэнты 2-га курса А.Акуліч, К.Чыручык. У дакладзе М.Наўроцкага быў разгледжаны стан акаляючага асяроддзя гарадскіх агламерацый Рэспублікі Беларусь, праведзены аналіз забруджвання атмасфернага паветра, паверхневых і падземных вод, глебаў, расліннасці і дадзена ацэнка экалагічнага стану гарадскога асяроддзя. А.Цыганоў у дакладзе "Праблемы развіцця і размяшчэння электраэнергетыкі Гомельскай вобласці" асноўную ўвагу ўдзяліў экалагічным праблемам, звязаным з электраэнергетычнымі аб'ектамі. На дастаткова высокім узроўні быў праведзены аналіз уздзеяння выкідаў цепластанцый на здароўе насельніцтва. Навуковы кіраўнік гэтых двух даследаванняў У.Я.Пашук.

На секцыі экалогіі лепшымі былі даклады Н.Карліонавай "Асаблівасці фаміравання авіфауны прыгарадных лясоў горада Гомеля", В.Наважылавай "Фанетычная структура жвавай яшчаркі на тэрыторыі зон адпачынку Гомельшчыны", В.Лук'яненка "Жужалі рода Carabus хвойных лясоў прыроднай зоны Гомеля". Усе вышэйпералічаныя даклады былі падрыхтаваны на аснове палявых матэрыялаў, атрыманых студэнтамі ў ходзе летніх практык, і ўяўляюць сабою невялікія, але самастойныя даследаванні. Атрыманыя дадзеныя дазваляюць меркаваць аб экалагічным стане зоны адпачынку Чонкі (навуковы кіраўнік работ — заг.кафедры экалогіі, дацэнт, к.б.н. А.М.Кусянкоў).

На секцыі геалогіі і разведкі найбольш высокі ўзровень дакладаў быў у студэнтаў С.Сяроўскага, А.Банкрашкова, Д.Бобрыка, А.Лапушка (4 курс), В.Лахрынай і В.Огнева (3 курс). З цікавасцю былі заслуханы даклады В.Огнева "Гравіметрычныя даследаванні тэрыторыі г.Гомеля" (кіраўнікі: прафесар кафедры геалогіі і разведкі, к.г.-м.н. А.П.Пінчук, ст.выкладчык Л.Л.Фядосенка) і А.Лапушка "Прыродная абароненасць падземных вод Добрушскага раёна Гомельскай вобласці" (кіраўнік — асістэнт кафедры геалогіі і разведкі С.У.Каваленка).

На канферэнцыі за паспяховую даследчую работу Ганаровымі граматамі Савета НДРС геолага-геаграфічнага факультэта былі адзначаны М.Наўроцкі, А.Курашоў, А.Цыганоў, А.Акуліч, Н.Карліонава, В.Наважылава, В.Лук'яненка.

У 1999 годзе студэнтамі геафака было апублікавана 48 навуковых работ; маюць публікацыі 22 студэнты спецыяльнасці "Экалогія"; 11 — спецыяльнасці "Геаграфія". На працягу 1999 года было ўкаранёна ў вучэбны працэс 13 работ (кафедра экалогіі —10; кафедра геаграфіі — 3).

Па выніках рэспубліканскага конкурсу на лепшую навуковую работу студэнтаў па прыродазнаўчых і тэхнічных навуках Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь другой ступені ўзнагароджаны студэнты факультэта А.Курашоў, А.Цыганоў, М.Наўроцкі (навуковы кіраўнік — У.Я.Пашук).

У мінулым годзе студэнты геолага-геаграфічнага факультэта прынялі таксама ўдзел у міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Біялагічныя рытмы" (Брэст); міжнароднай канферэнцыі "Сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя насельніцтва, пацярпеўшага ў тэхнагенных і экалагічных катастрофах" (Мінск), у рабоце 6-га з'езда Беларускага геаграфічнага таварыства (Магілёў); 2-й міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Навуковыя, сацыяльныя і культурныя праблемы студэнцкай моладзі", 11-га рэспубліканскага семінара "Вопыт і праблемы арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў" (Мінск); 3-й навукова-практычнай канферэнцыі маладых вучоных "Моладзь і экалагічныя праблемы сучаснасці" (Гомель); 1-й міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Экалагічныя праблемы Палесся і сумежных тэрыторый" (Гомель).

Найбольш актыўны ўдзел у арганізацыі НДРС прымаюць А.М.Кусянкоў, А.П.Гусеў, І.А.Шалякін, аўтар гэтых радкоў (кафедра экалогіі), А.П.Пінчук, Л.Л.Фядосенка, Ю.П.Іваноў (кафедра геалогіі і разведкі), У.Я.Пашук, Т.А. Шафарэнка, І.І.Богдэль (кафедра геаграфіі).

**Н.КОЎЗІК,**
**асістэнт кафедры экалогіі.**

*Традыцыі жывуць*

## БЫЛО ЦІКАВА І ВЕСЕЛА

У нашым універсітэце прайшло цудоўнае свята, прысвечанае Дню філолага. Ва ўрачыстых абставінах у першым корпусе адбылося яго адкрыццё. Прывітальныя словы былі сказаны ўдзельнікам свята дэканам факультэта дацэнтам кафедры беларускай мовы У.А.Бобрыкам. Добрым аздабленнем урачыстасці паслужылі выступленні і загадчыкаў кафедр, прафесараў У.І.Коваля, І.Ф.Штэйнера, А.А.Станкевіч і іншых выкладчыкаў. Яны жадалі далейшых поспехаў у навуковых працах, жартавалі наконт вясны і маладосці. Пасля былі ўручаны граматы за лепшыя студэнцкія працы.

У такім узбуджаным і радасным настроі ўсе адправіліся на навуковую канферэнцыю. Яна прайшла вельмі ўдала. Было заслухана шмат цікавых і пазнавальных дакладаў. Затым мы апынуліся ў актавай зале універсітэта, дзе пачалося ток-шоу з выкладчыкамі. Ім было зададзена шмат пытанняў рознага зместу. Дасціпныя ўдзельнікі адразу пачалі жартаваць. Студэнты ж, у сваю чаргу, даведаліся аб іх асабістым жыцці, густах і інтарэсах, дазналіся і пра студэнцкае жыццё выкладчыкаў. Было вельмі весела і цікава. Ток-шоу нават зацягнулася, але ніхто не жадаў пакідаць мерапрыемства, ні выкладчыкі, ні студэнты.

Былі праведзены таксама конкурс паэзіі і конкурс насценгазет. Пераможцы атрымалі падарункі і выказалі пажаданне праводзіць падобныя конкурсы часцей.

Увечары быў працяг свята — адбыўся канцэрт, які падрыхтавалі студэнты філалагічнага факультэта. Яны пакарылі прысутных шматграннасцю і разнастайнасцю сваіх здольнасцей. Выступаў таксама і СТЭМ, які паказаў новую, вельмі смешную мініяцюру, як і заўсёды здзівіў гледачоў сваёй індывідуальнасцю. Было шмат гумару, апладысменты не сканчаліся.

**А.БУЖАН,**
**студэнтка гр.Б-21**
**філалагічнага факультэта.**

*Выставы*

## ЯК ЖЫВЫЯ...

Гомель, як любы горад, не абдзелены ўвагай дзеячоў культуры.

На гэты раз да нас завіталі госці з Санкт-Пецярбурга. У галерэі мастацтваў па пр.Леніна працавала выстава васковых фігур пад назвай "Міфы і монстры".

Каб пазнаёміцца з працай майстраў паўночнай сталіцы, студэнты філалагічнага факультэта вырашылі наведаць гэтую выставу. Там давялося пабачыць шмат незвычайнага, цікавага і чароўнага. Перад вачыма паўсталі антычныя героі, істоты ніжэйшай міфалогіі, іншапланецяне ва ўяўленні сучаснікаў.

Экскурсавод паведаміла аб матэрыяле і тэхніцы вырабу васковых фігур. Экспанаты ўражваюць сваёй яркасцю, прыгажосцю, дасканаласцю. Яны нагадваюць жывых істот. Мы засталіся зачараванымі майстэрствам людзей, здольных стварыць такі цуд.

**Аксана БАРСУКОВА,**
**студэнтка гр.БА-13 філалагічнага факультэта.**

*Спорт*



У басейне гарадскога спартыўнага комплекса прайшло першынство па плаванню ў праграме круглагадовай спартакіяды сярод факультэтаў вну, дзе на старт выйшлі 24 каманды.

У агульнакамандным заліку лепшай была каманда плыўцоў факультэта фізічнай культуры, на другім і трэцім месцах — электратэхнічны і УПП БелДУТа.

Эканамічны факультэт заняў V-е месца, фізічны — VII-е, юрыдычны — XI-е месца.

***

У гарадскім спартыўным комплексе прайшло першынство Гомеля па армрэстлінгу, у якім прынялі ўдзел 12 каманд.

Каманда нашых студэнтаў пад кіраўніцтвам ст.выкладчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту Сяргея Пірагова заняла першае месца, на другім месцы студэнты ГДТУ імя П.Сухога і на трэцім — "Гомель-СК".

# ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЁМ СТУДЕНТОВ НА 1 КУРС ДНЕВНОГО ОТДЕЛЕНИЯ НА 2000 ГОД

В университет принимаются граждане Республики Беларусь и белорусы, проживающие за её пределами; граждане Российской Федерации, Республики Казахстан, Киргизской Республики; лица, постоянно проживающие на территории республики или имеющие статус беженца.

Указанные категории лиц имеют право получить в университете на базе среднего образования на конкурсной основе бесплатное высшее образование, если образование данного уровня получается впервые.

Граждане других зарубежных стран принимаются в университет на основе договоров с оплатой обучения.

Университет осуществляет приём студентов сверх плана приёма на условиях договоров с оплатой обучения юридическими или физическими лицами. На места сверх плана приёма, количество которых определяется приемной комиссией, на конкурсной основе зачисляются:

— абитуриенты, которые положительно сдали вступительные экзамены, но не прошли по конкурсу в университет;

— абитуриенты, которые имеют направления предприятий (организаций) и положительно прошли собеседование по предметам вступительных экзаменов.

**Собеседование** проводится **с 21 по 22 августа. Приём заявлений** от абитуриентов, поступающих в университет на условиях договоров с оплатой обучения, осуществляется **с 7 по 17 августа**.

**Приём заявлений с 26 июня по 15 июля. Вступительные экзамены с 17 июля. Зачисление в состав студентов**: по плану — **до 5 августа**, на условиях целевой контрактной подготовки и оплаты обучения — **до 25 августа**.

Поступающие в университет подают в приёмную комиссию следующие документы:

— заявление установленного образца на имя ректора;

— документ государственного образца о среднем образовании в оригинале;

— государственный сертификат (для тех, кто прошел централизованное тестирование и поступает на специальности "Автоматизированные системы обработки информации" и "Геология и разведка полезных ископаемых");

— 6 чёрно-белых фотографий размером 3x4;

— медицинскую справку по форме 086У;

— выписку из трудовой книжки (для тех, кто работает);

— справку из службы занятости населения (для тех, кто находится на её учёте);

— документы, которые подтверждают право абитуриентов на льготы, установленные законодательством Республики Беларусь, или свидетельствуют о личных талантах и способностях абитуриентов. Эти документы предоставляются в приёмную комиссию до начала вступительных экзаменов.

Абитуриенты, поступающие не в год получения среднего образования, обязаны представить документы, которые подтверждают их работу или учёбу за годы, предшествующие поступлению (диплом, выписку из трудовой книжки, справку из службы занятости населения и др.).

Паспорт или другое свидетельство личности, выданное органами МВД, предъявляются в приёмную комиссию абитуриентом лично.

Все вступительные экзамены, за исключением экзамена по белорусскому или русскому языку и литературе для поступающих на нефилологические специальности, являются конкурсными. Они (кроме экзамена по спецфизподготовке) проводятся по программам, которые составлены в соответствии с учебными программами общего среднего образования и утверждены Министерством образования Республики Беларусь. Все экзамены проводятся с оценкой знаний по шестибалльной системе (2; 3; 3,5; 4; 4,5; 5).

Абитуриенты, которые не явились на экзамен без уважительных причин или получили неудовлетворительную оценку, к дальнейшим экзаменам не допускаются.

Апелляции по вопросам экзаменационных оценок подаются ответственному секретарю приёмной комиссии на имя ректора в день проведения устного экзамена или в день объявления оценки по письменному экзамену. Повторная сдача экзамена не разрешается.

При приёме на специальности "Автоматизированные системы обработки информации" и "Геология и разведка полезных ископаемых" засчитываются результаты централизованного тестирования в соответствии с представленным государственным сертификатом.

Зачисление на все специальности, кроме специальностей педагогического профиля, по которым осуществляется целевая контрактная подготовка, проводится по отдельному конкурсу среди выпускников городских и сельских школ пропорционально поданным заявлениям в соответствии с количеством баллов, набранных абитуриентами на вступительных экзаменах. В тех случаях, если конкурсный балл среди выпускников сельских школ равен или превышает конкурсный балл среди выпускников городских школ, зачисление проводится по общему конкурсу.

Конкурс проводится по специальностям, кроме специальностей "Физика" и "Прикладная математика", где конкурс проводится по отделениям, и специальностей "Русский язык и литература" и "Белорусский язык и литература", где конкурс проводится по специализациям.

Выпускники подготовительного отделения при университете зачисляются в соответствии с "Положением о подготовительном отделении при Гомельском государственном университете имени Ф.Скорины". Лица, которые прошли обучение через другие формы довузовской подготовки при университете, зачисляются на общих основаниях.

Количество абитуриентов, зачисленных в результате совмещения выпускных и вступительных экзаменов, не должно превышать 20% от контрольных цифр приёма по данной специальности.

Лица, закончившие среднее общеобразовательное учебное заведение с медалью, среднее специальное учебное заведение или ПТУ (на основе базовой школы с получением среднего образования) с дипломом с отличием:

а) при поступлении на специальности "Математика", "Физика", "Физика" с дополнительной специальностью "Техническое творчество", "Физическая электроника", "Автоматизированные системы обработки информации", "Геология и разведка полезных ископаемых", "Биология" зачисляются после сдачи вступительного экзамена по профилирующей дисциплине (указана в перечне вступительных экзаменов первой) на оценку "5", а при получении другой положительной оценки сдают остальные вступительные экзамены и участвуют в общем конкурсе;

б) при поступлении на другие специальности сдают все вступительные экзамены.

Победители (I, II, III места) международных и республиканских предметных олимпиад школьников, учащихся средних специальных и профессионально-технических учебных заведений, проведенных Министерством образования в текущем учебном году, освобождаются от сдачи вступительного экзамена по соответствующему предмету с выставлением оценки "пять".

Победители (I, II, III места) республиканских конкурсов и олимпиад профессионального мастерства учащихся средних специальных и профессионально-технических учебных заведений при условии окончания учебного заведения с дипломом с отличием и поступления на соответствующие специальности зачисляются без вступительных экзаменов.

Вне конкурса при получении положительных оценок на вступительных экзаменах зачисляются:

— воины-интернационалисты;

— дети-сироты и дети, оставшиеся без опеки родителей;

**(Окончание на 4-й стр.)**

## ПЕРЕЧЕНЬ ВСТУПИТЕЛЬНЫХ ЭКЗАМЕНОВ:

| Специальности | Экзамены |
|---|---|
| Русский язык и литература<br>Русский язык и литература со специализацией "Белорусский язык и литература" | 1. Русский язык (диктант)<br>2. Русский язык и литература (устно)<br>3. Белорусский язык и литература (устно) |
| Белорусский язык и литература | 1. Белорусский язык (диктант)<br>2. Белорусский язык и литература (устно)<br>3. Русский язык и литература (устно) |
| Белорусский язык и литература со специализацией "Литературная работа в газетах и журналах" | 1. Собеседование<br>2. Белорусский язык (диктант)<br>3. Белорусский язык и литература (устно)<br>4. Русский язык и литература (устно) |
| Белорусский язык и литература со специализацией "Английский язык" | 1. Белорусский язык (диктант)<br>2. Английский язык (устно, с аудированием и лексико-грамматическим тестом)<br>3. Белорусский язык и литература (устно) |
| Английский язык | 1. Английский язык (письменно)<br>2. Английский язык (устно)<br>3. История Беларуси (устно)<br>4. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (сочинение) |
| Немецкий язык | 1. Немецкий язык (письменно)<br>2. Немецкий язык (устно)<br>3. История Беларуси (устно)<br>4. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (сочинение) |
| Математика<br>Бухгалтерский учёт, анализ и аудит<br>Экономика и управление на предприятии<br>Коммерческая деятельность<br>Финансы и кредит<br>Прикладная математика (производственное и производственно-педагогическое отделения) | 1. Математика (устно)<br>2. Математика (письменно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| Мировая экономика и международные экономические отношения | 1. Математика (письменно)<br>2. Иностранный язык (письменно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| Физика (производственное и педагогическое отделения)<br>Физика с дополнительной специальностью "Техническое творчество"<br>Физическая электроника<br>Автоматизированные системы обработки информации<br>Геология и разведка полезных ископаемых | 1. Физика (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| История | 1. История Беларуси (устно)<br>2. Иностранный язык (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (сочинение) |
| История с дополнительной специальностью "Английский язык" | 1. История Беларуси (устно)<br>2. Английский язык (устно, с аудированием и лексико-грамматическим тестом)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (сочинение) |
| Правоведение | 1. История Беларуси (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Иностранный язык (устно)<br>4. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (сочинение) |
| География | 1. География (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| Экология | 1. География (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| Психология | 1. Математика (устно)<br>2. Биология (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| Биология | 1. Биология (устно)<br>2. Химия (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| Физическая культура и спорт | 1. Экзамен по спецфизподготовке<br>2. Биология (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |

# ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЁМ СТУДЕНТОВ НА 1 КУРС ДНЕВНОГО ОТДЕЛЕНИЯ НА 2000 ГОД

**(Окончание. Начало на 3-й стр.)**

— дети из семей военнослужащих или рабочих и служащих, которые занимали штатные должности в воинских частях, погибших (умерших) или ставших инвалидами во время прохождения воинской службы или работы в составе советских войск на территории государств, где велись боевые действия, а также дети из семей военнослужащих, погибших (умерших) в мирное время при прохождении воинской службы;

— дети из семей лиц начальственного и рядового состава органов внутренних дел, погибших (умерших) или ставших инвалидами при исполнении служебных обязанностей на территории государств, где велись боевые действия, а также погибших (умерших) в мирное время при исполнении служебных обязанностей;

— инвалиды I и II групп, а также дети-инвалиды, которым в соответствии с заключением медико-реабилитационных экспертных комиссий не противопоказано обучение в вузе и которые могут посещать занятия;

— лица, которые имеют льготы в соответствии со ст.18 Закона Республики Беларусь "О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС". Абитуриенты этой категории, которые закончили учебные заведения с отличием (с отличными оценками), зачисляются по результатам собеседования по предметам вступительных экзаменов. **Собеседование** проводится **13 июля;**

— белорусы зарубежья по рекомендациям белорусских организаций или учебных заведений зарубежья на специально выделенные органами управления учебными заведениями места.

При равенстве конкурсных баллов преимущество имеют:

— инвалиды III группы при отсутствии медицинских противопоказаний;

— лица, которые имеют льготы в соответствии со ст.19, 20, 23, 24, 25 Закона Республики Беларусь "О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС";

— уволенные в запас военнослужащие, имеющие льготы, установленные законодательством, и рекомендации воинских частей;

— выпускники Национального государственного гуманитарного лицея имени Якуба Коласа при поступлении на соответствующие специальности;

— лица, имеющие стаж работы не менее двух лет;

— победители областных предметных олимпиад 1999-2000 уч. года; победители областного конкурса по техническому творчеству 1999-2000 уч. года при поступлении на специальность "Физика" с дополнительной специальностью "Техническое творчество";

— медалисты средних общеобразовательных учебных заведений, отличники средних специальных учебных заведений и ПТУ на основе базовой школы, а также отличники ПТУ на основе средней школы при поступлении на специальности, соответствующие полученным профессиям;

— профессионально ориентированные абитуриенты (закончили факультет довузовской подготовки и профориентации, имеют стаж работы по специальности, соответствующей избранной, или другую профессиональную ориентацию).

Университет осуществляет целевой контрактный прием. Зачисление абитуриентов на условиях целевой контрактной подготовки специалистов осуществляется по отдельному конкурсу согласно доведенных планов целевого контрактного приема и соответствующего положения.

Для получения второго высшего образования, как правило, принимаются лица на условиях полной оплаты обучения. Порядок зачисления этих лиц определяется соответствующим положением.

Все другие вопросы, связанные с приёмом, окончательно решаются приёмной комиссией университета на основе законодательства Республики Беларусь и "Порядка приёма в государственные высшие учебные заведения Республики Беларусь на 2000 год".

Документы направлять по адресу: 246699, г. Гомель, ул. Советская, 104, Гомельский госуниверситет им. Ф.Скорины, приёмная комиссия. Телефоны: 56-73-38 (приёмная комиссия), 57-69-17 (ответственный секретарь).

## ЭКЗАМЕН ПО СПЕЦИАЛЬНОЙ ФИЗИЧЕСКОЙ ПОДГОТОВКЕ

Исходным положением экзаменов по специальной физической подготовке является определение уровня общефизической подготовки и двигательного аппарата абитуриентов.

Сдача экзаменов начинается с дифференцированного зачета по плаванию и при успешной его сдаче абитуриенты продолжают сдавать экзамен по специальной физической подготовке. Он включает нормативы и требования спортивного многоборья, в котором предусмотрено выполнение четырех обязательных видов физических упражнений в соответствии с существующими правилами соревнований.

Результат каждого вида физических упражнений оценивается в зачетных баллах **(см.таблицу).** В таблице также показаны нормативы и требования к зачету по плаванию. Дистанцию можно проплыть одним из существующих стилей плавания, предусмотренных спортивной классификацией.

Необходимо отметить, что выполнение любого спортивного норматива четырехборья ниже зачетного оценивается двумя ("2") баллами, которые не являются зачетными и не входят в общую сумму балльной оценки за экзамен.

## КРИТЕРИИ ОЦЕНКИ АБИТУРИЕНТОВ ПО СПЕЦИАЛЬНОЙ ФИЗИЧЕСКОЙ ПОДГОТОВКЕ

### на вступительных экзаменах в ГГУ им. Ф. Скорины

| № п/п | Виды многоборья | Возраст | Нормативные требования и зачетные баллы | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Мужчины | | | | | Женщины | | | | |
| | | | 5 | 4.5 | 4 | 3.5 | 3 | 5 | 4.5 | 4 | 3.5 | 3 |
| 1 | Бег 100м (сек) | 17-29 | 12.6 | 12.8 | 13.1 | 13.3 | 13.6 | 14.5 | 15.0 | 15.5 | 16.0 | 16.5 |
| | | 30 и более | 13.0 | 13.2 | 13.5 | 13.7 | 14.0 | 15.0 | 15.5 | 16.0 | 16.5 | 17.0 |
| 2 | Бег 1000м (мин, сек) | 17-29 | 3.05 | 3.07 | 3.10 | 3.15 | 3.20 | 3.52 | 4.01 | 4.10 | 4.20 | 4.30 |
| | | 30 и более | 3.15 | 3.20 | 3.25 | 3.30 | 3.35 | 4.10 | 4.20 | 4.30 | 4.45 | 5.00 |
| 3 | Метание гранаты (м) | 17-29 | 48.0 | 46.0 | 44.0 | 41.0 | 38.0 | 32.0 | 30.0 | 27.0 | 25.0 | 22.0 |
| | | 30 и более | 45.0 | 43.0 | 41.0 | 38.0 | 35.0 | 27.0 | 25.0 | 22.0 | 20.0 | 18.0 |
| 4 | Подтягивание в висе на перекладине хватом сверху (кол-во раз) | 17-29 | 16 | 14 | 12 | 10 | 8 | - | - | - | - | - |
| | | 30 и более | 13 | 11 | 9 | 7 | 5 | - | - | - | - | - |
| | Сгибание и разгибание рук в упоре лежа (сгибание рук не менее $90^0$, кол-во раз) | 17-29 | - | - | - | - | - | 28 | 25 | 22 | 18 | 14 |
| | | 30 и более | - | - | - | - | - | 22 | 20 | 18 | 14 | 10 |
| * | *Плавание 100м (мин, сек)* | | | | | | | | | | | |
| – | Вольный стиль | 17-29 | 1.32 | 1.40 | 1.47 | 1.55 | 2.02 | 1.38 | 1.46 | 1.53 | 2.01 | 2.08 |
| | | 30 и более | 1.42 | 1.50 | 1.57 | 2.05 | 2.12 | 1.48 | 1.56 | 2.03 | 2.11 | 2.18 |
| – | Брасс | 17-29 | 1.45 | 1.53 | 2.00 | 2.08 | 2.15 | 2.03 | 2.11 | 2.18 | 2.26 | 2.33 |
| | | 30 и более | 1.55 | 2.03 | 2.10 | 2.18 | 2.25 | 2.13 | 2.21 | 2.28 | 2.36 | 2.43 |
| – | Кроль на спине | 17-29 | 1.45 | 1.53 | 2.00 | 2.08 | 2.15 | 1.53 | 2.01 | 2.08 | 2.16 | 2.23 |
| | | 30 и более | 1.55 | 2.03 | 2.10 | 2.18 | 2.25 | 2.03 | 2.11 | 2.18 | 2.26 | 2.33 |

* - дифференцированный зачет

Таким образом, оценка по специальной физической подготовке состоит из суммы результатов только зачетных баллов, набранных абитуриентом в спортивном многоборье:

От 18 до 20 баллов — 5 (пять)
От 16 до 17 баллов — 4,5 (четыре с половиной)
От 14 до 15 баллов — 4 (четыре)
От 12 до 13 баллов — 3,5 (три с половиной)
От 10 до 11 баллов — 3 (три)

# ПРАВІЛЫ АФАРМЛЕННЯ АРТЫКУЛАЎ ДЛЯ АЎТАРАЎ ЧАСОПІСА

## "Известия Гомельского государственного университета имени Ф.Скорины"

Артыкул прадстаўляецца ў рэдакцыю (прыёмную галоўнага рэдактара) у двух экземплярах на беларускай, рускай ці англійскай мовах і з'яўляецца арыгіналам для друку. У тэксце не дапускаюцца рукапісныя ўстаўкі і ўклейкі.

Артыкул павінен мець дазвол на апублікаванне адпаведнай навуковай установы. Перад артыкулам указваецца індэкс па Універсальнай дзесяцічнай класіфікацыі (УДК). Разам з артыкулам здаецца рэферат, рэзюме (на англійскай мове, калі артыкул на рускай мове; на англійскай і рускай мовах, калі артыкул на беларускай мове; на рускай мове, калі артыкул на англійскай мове) у двух экземплярах. Перад артыкулам указваюцца прозвішча і ініцыялы аўтара і назва артыкула.

Артыкул падпісваецца аўтарам, указваецца поўная назва ўстановы, у якой выканана работа, а таксама паштовы адрас, нумар тэлефона (службовы і хатні).

Пасля рэцэнзавання аўтар прадстаўляе канчатковы варыянт на дыскеце (ці па электроннай пошце e-mail: vesti@gsu.unibel.by ) і ў надрукаваным выглядзе. Тэкст друкуецца ў рэдактары Microsoft Word - 97, шрыфт - 11. Пры гэтым аб'ём артыкула не павінен перавышаць дзесяці старонак (іх нумарацыя не выстаўляецца). Табліцы, малюнкі і інш. уваходзяць у названы аб'ём.

Артыкулы, якія прэтэндуюць на навуковы прыярытэт, афармляюцца ў выглядзе кароткіх паведамленняў да дзвюх старонак тэкста і, як правіла, публікуюцца ў бліжэйшых нумарах часопіса.

Спасылкі ў тэксце падаюцца ў квадратных дужках па парадку нумароў. Спіс выкарыстаных крыніц змяшчаецца ў канцы артыкула. Спасылкі на неапублікаваныя работы не дапускаюцца.

Артыкулы, якія паступілі ў рэдакцыю, накіроўваюцца на рэцэнзіі спецыялістам. Асноўным крытэрыем мэтазгоднасці публікацыі з'яўляецца навуковая навізна і інфарматыўнасць артыкула. Калі па рэкамендацыі рэцэнзента артыкул вяртаецца аўтару на дапрацоўку, то перапрацаваны рукапіс зноў разглядаецца рэдкалегіяй і датай паступлення лічыцца дзень атрымання рэдакцыяй канчатковага варыянта.

Рэдакцыя пакідае за сабой права адхілення артыкула, калі значная частка яго зместу не адпавядае тэматычнаму профілю часопіса. Рэдакцыя не вядзе дыскусію па матывах адхілення.

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ ЧАСОПІСА "ИЗВЕСТИЯ ГОМЕЛЬСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ".**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— гісторыі Беларусі — дацэнта (2);
— тэорыі і гісторыі дзяржавы і права — асістэнта;
— грамадзянска-праваых дысцыплін — ст.выкладчыка;
— гісторыі ўсходнеславянскіх народаў — дацэнта;
— усеагульнай гісторыі — дацэнта 0,5 стаўкі;
— беларускай літаратуры — дацэнта
— французскай мовы — ст.выкладчыка;
— нямецкай мовы — заг.кафедры, дацэнта(2), выкладчыка;
— англійскай мовы — дацэнта;
— эканамічнай інфарматыкі і АСК — дацэнта 0,5 стаўкі;
— эканамічных тэорый — дацэнта па пазабюджэтнай дзейнасці;
— агульнай фізікі — дацэнта 0,5 стаўкі, ст.выкладчыка (2);
— радыёфізікі і электронікі — дацэнта (2);
— фізвыхавання і спорту — ст.выкладчыка;
— аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры — дацэнта, ст.выкладчыка;
— хіміі — дацэнта;
— геалогіі і разведкі карысных выкапняў — ст.выкладчыка 0,25 стаўкі.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

У паведамленні аб конкурсе, апублікаваным 13.04.2000г., трэба чытаць: замест выкладчыка па кафедры фізвыхавання і спорту — ст.выкладчыка.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў філалагічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне намесніку дэкана па выхаваўчай рабоце, дацэнту кафедры беларускай літаратуры **МАМАЧКІНУ** Дзмітрыю Леанідавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 217.
Падпісана да друку 21.04.2000 г.